

**ЛІДСКІ ЗАМАК, XIV СТ.**

Будаўніцтва Лідскага замка, аднаго з самых вялікіх на тэрыторыі Беларусі мураваных замкаў XIV ст., прыпадае на яго 30-ыя гады. У гэты час беларускаму і літоўскаму народам пагражала крыжацкая навала. Каб супрацьстаяць аднаму з лепшых у тагачаснай Еўропе крыжацкаму войску, трэба было мець цэлы шэраг мураваных замкаў, выцягнутых у вялікі ланцуг паміж сучаснымі Навагрудкам і Тракаем. Будаўнікі Лідскага замка, сярод якіх маглі быць і паўночнанямецкія (ганзейскія) майстры, запрошаныя ў краіну князем Гедымінам у 1323 годзе[1], узялі за аснову шырока распаўсюджаны ў прыбалтыйскіх землях тып абарончага збудавання, вядомага пад назваю «кастэль». Гэты тып мураванага замка яны ўдала прыстасавалі да мясцовых умоў: замкавы двор быў пашыраны да 80×80 м, надчас небяспекі там збіралася войска, хаваліся мясцовыя жыхары.

Для будаўніцтва была абрана невялікая пясчаная выспа ў балоцістых сутоках двух невялікіх рэчак — Лідзеі і Каменкі. Выспу пераўтварылі ў прамавугольную пляцоўку, дасыпаўшы месцамі жвірам, камянямі і буйной рачной галькай да вышыні 5—6 м. З поўначы, на адлегласці 7 м ад замкавай сцяны, выкапалі шырокі (каля 20 м) роў, які злучаў дзве ракі і аддзяляў замак ад горада. Пазней, магчыма ў XVI-XVII стст., у сістэму перадзамкавых умацаванняў увайшло штучнае возера, што прыкрывала замак з усходу. Гэта возера ёсць на планах і малюнках XVIII—XIX стст.

Замак пабудаваны з палявога каменя і цэглы. Асноўны цяжар абароны прымалі на сябе сцены і дзве вежы (адна з іх узведзена пазней), якія не выступалі за лінію замкавых муроў і месціліся ў супрацьлеглых замкавых кутах. Сцены маюць неглыбокія падмуркі (70—80 см), іх таўшчыня ўнізе — 2 м, уверсе яны звужаюцца да 1,5 м і пераходзяць у баявую галерэю. Цагляная сцяна галерэі таўшчынёй 70 см не выступае за паверхню замкавага мура, мае адзін рад байніц трох тыпаў. Адлегласць паміж байніцамі каля 3,3 м. Памост галерэі абапіраўся на драўляныя бэлькі сячэннем 20×20 см. На паўднёвай і ўсходняй сценах былі два цагляныя данскеры на каменных фігурных кансолях.

У 1970 г. Лідскі замак даследаваў М. А. Ткачоў[2], а ў 1977—78, 1980 і 1985 гг. — аўтар гэтага артыкула[3]. У выніку раскопак дакладна вывучаны рэшткі вежаў. Ад паўднёва-заходняй вежы збераглісся толькі фрагменты падмуркаў. Яны зроблены без прывязкі да замкавых сценаў, але на адным узроўні з іх падмуркамі. Гэта сведчыць пра тое, што замак і яго паўднёва-заходняя вежа, якая ў плане амаль квадратная (9×9), былі пабудаваны адначасова. Шырыня падмуркаў каля 3 м, глыбіня — да 70 см. Яны складзены з вялікіх і сярэдніх камянёў, ніжнія рады перасыпаны чырванаватай глінай, а верхнія пакладзены на вапнавай рошчыне.

Ацалелыя сцены паўночна-ўсходняй вежы мелі вышыню ад 4 да 8 м. Вежа прыбудавана да замкавых муроў без прывязкі. Таўшчыня сценаў, што выходзілі ў двор, — 3 м, а таўшчыня дакладак да сценаў замка — 83 см. Падмуркі вежы закладзены на 70—80 см глыбей падмуркаў замкавых сценаў (гэта сведчыць пра тое, што яны былі пабудаваны ў розны час). Вежа мела арачны ўваход з боку двара і лесвіцу ў тоўшчы заходняй сцяны шырынёй 1 м з драўлянымі прыступкамі на цаглянай аснове. Паўночная і ўсходняя сцены ўсярэдзіне маюць па дзве нішы. У паўднёвай сцяне збераглісся дзве глыбокія пячныя нішы (верхнія паверхі некалі ацяпляліся). Першы паверх быў перакрыты крыжовым сутарэннем. Знойдзены рэшткі драўлянай падлогі.[4]

Замак меў тры ўваходы. У паўднёвай сцяне ў 22 м ад вежы ёсць невялікі паўцыркульны праём на вышыні 4 м ад першапачатковага ўзроўню двара. Ва ўсходняй сцяне былі два ўваходы: малы, зроблены на ўзроўні сцяны, і вялікі, размешчаны каля вежы на вышыні 2,5 м.

Праём малога ўваходу па форме спічасты (вышыня 2,45 м). Збераглісся рэшткі ад бегуноў брамы, якая зачыняла ўваход. Гэта два вялікія камяні ў аснове аркі з круглымі гнёздамі-адтулінамі. Знадворку гэты ўваход бараніла падковападобнае



збудаванне, ад якога засталіся нязначныя рэшткі падмуркаў. Вялікі ўваход меў разгрузачную спічастую нішу, якую праразаў уваходны праём меншых памераў. Гэта дазваляе выказаць думку пра тое, што тут быў пад'ёмны мост.

Замкавыя і вежавыя муры ў асноўным складзены з палявых камянёў. Вонкавыя паверхні зроблены з вялікіх, часам крыху абчасаных валуноў, якія добра падабраны па памерах і пакладзены гарызантальнымі, дакладна вызначанымі радамі. Прамежкі паміж камянямі запоўнены каменнымі аскалёпкамі на вапнавай рошчыне (цагляныя кліны сустракаюцца вельмі рэдка). Забутоўка паміж «шчокамі» сценаў рабілася з дробных камянёў. У якасці арматуры выкарыстоўваліся драўляныя бэлькі. З цэглы рабілі толькі асноўныя канструкцыйныя элементы і архітэктурныя дэталі (куты замкавых і вежавых муроў, дэкаратыўныя паясы на фасадах сценаў, аркі, скляпенні, байніцы і вонкавыя паверхні крэнеляжу). Цагляныя паясы на вонкавай паверхні замкавых сценаў выкладзены ў тэхніцы балтыйскай, або вендскай, муроўкі (чаргаванне двух лажкоў і тычка). Вапнавая рошчына, на якой пакладзена цэгла, уключае дамешкі з жвіру і дробных каменьчыкаў, таўшчыня швоў вагаецца ад 2 да 3 см. Будаўнікі ўжывалі цэглу двух тыпаў памерамі 31×15×10 см і 31×14×7 см, прычым больш тонкая цэгла выкарыстана толькі ў абрамоўцы крэнеляжу.

Археалагічныя даследаванні дазваляюць сцвярджаць, што ў першай палове XIV ст. існавала толькі паўночна-заходняя вежа (яна выконвала ахоўную функцыю, у ёй жа і жылі). Асноўны цяжар абароны прымалі муры з баявой галерэяй, якія яшчэ не былі разлічаны на ўжыванне вогнестрэльнай зброі.

У канцы XIV — пачатку XV ст. у сувязі з развіццём ваеннай справы для ўмацавання замка будуецца другая вежа з разлікам на гарматны бой. Цэгла для ўзвядзення вежы мела іншыя памеры — 29-30×14×7,5-8 см.

Рэбры нярвюраў у скляпенні першага паверха вежы былі зроблены са стрэлападобнай цэглы. Абедзве вежы ў гэты час былі накрыты паўцыркульнай дахоўкай. Падчас раскопак двара высветлілася, што з трох бакоў (акрамя паўднёвага) да замкавых муроў былі прыбудаваны драўляныя будынкі, ад якіх зберагліся рэшткі падмуркаў, печаў і абгарэлага бярвення. Шырыня будынкаў каля 4 метраў. Будынак каля заходняй сцяны вылучаўся большымі памерамі (6×4 м) і меў каменны падмурак, пакладзены на гліну. Ва ўсходняй частцы двара знойдзены дзве студні. У адной з іх зберагліся рэшткі драўлянага зруба. Сярэдзіна двара была забрукавана.

Такім чынам, у XV ст. Лідскі замак уяўляў сабою абарончае збудаванне тыпу «канвентхаўза» з аднапавярховымі будынкамі па перыметру сценаў для гарнізона і складоў, сярод якіх вылучаўся дом, дзе жыў камендант замка (кашталян). Такі тып кампазіцыі замка быў распаўсюджаны на тэрыторыі Прусіі, сучаснай Латвіі і іншых прыбалтыйскіх земляў.

Гістарычны лёс Лідскага замка быў вельмі складаны. У XIV ст. яго муры не раз штурмавалі крыжакі. Даставалася яму і падчас міжусобных войнаў. У пачатку XVI ст. пад яго сцены падыходзілі крымскія татары, але штурмаваць такое ўмацаванне пабаяліся. Самыя значныя разбурэнні Лідскага замка былі падчас руска-польскай (XVII ст.) і Паўночнай войнаў.

Пасля Паўночнай вайны, калі шведы ўзарвалі абедзве вежы, замак ужо не аднаўляўся і паступова прыйшоў у заняпад. Невялікія кансервацыйныя работы былі зроблены ў пачатку і ў канцы 1920-ых гадоў. Цяпер здзейснена поўная кансервацыя ацалелых замкавых муроў і вядзецца аднаўленне яго сценаў і вежаў. Пасля рэстаўрацыі тут размесцяцца музей і тэатр пад адкрытым небам (пасярод былога замкавага двара).

**Алег ТРУСАЎ,**
**кандыдат гістарычных навук.**

---

[1] Narbutt T. Dzieje narodu Litewskiego. Wilno, 1839. T. IV.
[2] Ткачоў М. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII—XVIII стст. Мн., 1978. С. 28—32.
[3] Трусаў А. Архітэктурна-археалагічнае даследаванне Лідскага замка // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1979. № 4. С. 16—19.
[4] Багласов С., Трусов О. Историко-архитектурные исследования и реставрация Лидского замка // Вопросы архитектуры Литовской ССР. 1981. УП (П). С. 32—34.